**УДК 34:930**

***Дзмітрый Якаўчык***
*выкладчык кафедры*
*сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь)*

***Dzmitry Yakauchyk***
*Lecturer of the Social*
*and Humanitarian Disciplines dept.*
*of the Mogilev Institute*
*of the Ministry of Internal Affairs (Belarus)*

***Варвара Няхаева***
*курсант факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь)*

***Varvara Nekhaeva***
*Cadet of the Mogilev Institute*
*of the Ministry of Internal Affairs (Belarus)*

# ЗАКАНАДАЎЧАЕ ЗАМАЦАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ НАРОДА Ў ДЗЯРЖАВАХ — УДЗЕЛЬНІЦАХ САДРУЖНАСЦІ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ

*Нет благороднее миссии, чем сохранение*
*исторической памяти во имя светлого будущего.*
*А. Г. Лукашенко*[1]

*Захаванне гістарычнай памяці з'яўляецца адным з самых актуальных пытанняў на ўсіх узроўнях грамадскага жыцця. Дадзенае пытанне не магло з'ўляцца толькі дыскусійным, і шэрагам дзяржаў прыняты меры па заканадаўчым замацаванні палажэнняў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці, устанаўленне адказнасці за фальсіфікацыю гістарычных падзей. У краінах — удзельніцах Садружнасці Незалежных Дзяржаў праведзена і праводзіцца актыўная работа па змяненні і дапаўненні заканадаўства ў галіне заканадаўчага замацавання пытанняў гістарычнай памяці. Гэты артыкул прысвечаны параўнальнаму аналізу заканадаўчага замацаванню гэтых пытанняў у дзяржавах — удзельніцах Садружнасці Незалежных Дзяржаў.*

[1] Об исторической памяти [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь : [сайт]. URL: https://president.gov.by/ru/quotes/category/ob-istoricheskoy-pamyati (дата обращения: 14.06.2024).

У цяперашні час гістарычная памяць з'яўляецца адной з найбольш актуальных і дыскусійных праблем у сацыяльных ведах. Цікавасць да дазенай тэмы абумоўлена тым, што для паўнавартаснага развіцця любога грамадства неабходна задумвацца над пытаннямі захавання і перадачы будучым пакаленням перажытага, назапашаных каштоўнасцей, мадэлей паводзін, элементаў нацыяльна-культурнай спадчыны.

У навуковай літаратуры існуе мноства азначэнняў тэрміна «гістарычная памяць», але з усіх гэтых азначэнняў адзначым агульнае: гістарычная памяць — гэта працэс па перадачы і захаванні сукупнасці сапраўдных ведаў аб падзеях, з'явах і працэсах мінулага, неабходных для фарміравання патрыятычнага грамадства і аб'ектыўнага светапогляду. Менавіта гэтымі прычынамі, на думку аўтараў, і абумоўлены змены ў заканадаўстве, накіраваныя на замацаванне гістарычнай памяці.

*Рэспубліка Беларусь*. Гістарычная памяць — адзін з прыярытэтных напрамкаў у дзейнасці дзяржавы. Важным перыядам у гэтым пытанні можна лічыць 2022 г., які адпаведным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Указам прадпісана, што асноўнымі мэтамі года з'яўляецца фарміраванне аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захаванне і ўмацаванне адзінства беларускага народа [1].

2022 год у Рэспубліцы Беларусь таксама азнаменаваў канстытуцыйныя змены. Прынятыя рэспубліканскім рэферэндумам змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь закранулі таксама і пытанні гістарычнай памяці. Папярэднімі рэдакцыямі Канстытуцыі адказнасць за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны (мяркуем, што гістарычная памяць з'яўляецца кампанентам гісторыка-культурнай спадчыны) ускладалася толькі на дзяржаву (арт. 15 Канстытуцыі). Новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дапоўніла арт. 54, у якім да ўжо раней прапісанага абавязку кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь берагчы гісторыка-культурную спадчыну з гэтага часу прама прапісаны абавязак па праяве патрыятызму, «захаванні гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа» [2]. Дапоўнены і арт. 32 Канстытуцыі, які зацвердзіў абавязак бацькоў і асоб, якія іх замяняюць, па прывіванні гістарычных традыцый Беларусі: «Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, маюць права і абавязаны выхоўваць дзяцей, клапаціцца аб іх здароўі, развіцці і навучанні, рыхтаваць да грамадска карыснай працы, прывіваць культуру і павагу

да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі» [2]. Гістарычныя традыцыі аўтары лічаць таксама элементам захавання гістарычнай памяці, паколькі традыцыямі перадаецца вопыт ад пакалення да пакалення. Таксама зменены і арт. 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у частцы замацавання забеспячэння дзяржавай «захавання гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» [2].

Падобныя змены сведчаць аб тым, што дзяржава лічыць неабходным ускласці абавязак па захаванні гістарычнай памяці на кожнага грамадзяніна. Прадугледжваецца, што такі падыход дасць магчымасць найбольш эфектыўна дасягаць названай мэты, што, безумоўна, мае права на жыццё — калі такі абавязак ускладаецца не толькі на дзяржаву, але і на жыхароў краіны, то і большая колькасць людзей імкнецца забяспечыць гістарычную памяць.

Асобна неабходна згадаць заканадаўчае замацаванне захавання гістарычнай памяці і праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя вышэйзгаданых палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, нарматыўным замацаваннем у дадзенай галіне можна лічыць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму», прыняты ў маі 2021 г., а таксама змены, што наступілі ў выніку выдання гэтага Закона, у Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь. Вынікам змен стала ўсталяванне новага злачынства — рэабілітацыі нацызму, якое адлюстравана ў арт. $130^1$. Таксама замацаваны і гістарычны факт генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: асноўныя палажэнні замацаваны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа», а адказнасць за яго адмаўленне стала лічыцца злачынствам, якое знайшло сваё адлюстраванне ў арт. $130^2$ Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь [3].

*Расійская Федэрацыя*. Вопыт па заканадаўчым замацаванні гістарычнай памяці ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь можна назваць падобным. У Расіі пытанне аб захаванні гістарычнай памяці знайшло сваё адлюстраванне ў новай рэдакцыі Канстытуцыі. Артыкул 67.1, які з'явіўся ў Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі ў 2020 г., замацаваў адразу палажэнні як аб захаванні гістарычнай памяці ў цэлым, так і памяці аб абаронцах Айчыны ў прыватнасці. Таксама ў Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі яшчэ раней меліся палажэнні аб абавязку кожнага грамадзяніна аб захаванні гістарычнай спадчыны (арт. 44) [4]. У Крымінальным кодэксе Расійскай Федэрацыі таксама ўстаноўлена

адказнасць за распаўсюджванне ілжывых звестак аб дзейнасці СССР у гады Другой сусветнай вайны і рэабілітацыю нацызму (арт. 354.1 Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі) [5]. Аднак трэба адзначыць, што гэтыя палажэнні замацаваны ў заканадаўстве Расійскай Федэрацыі значна раней, чым у Рэспубліцы Беларусь, — у 2014 г.

Таксама нарматыўным актам у вобласці захавання гістарычнай памяці можна лічыць Федэральны Закон «Аб аб'ектах культурнай спадчыны (помніках гісторыі і культуры) народаў Расійскай Федэрацыі», адной з мэт якога з'яўляецца рэалізацыя «канстытуцыйнага абавязку кожнага клапаціцца аб захаванні гістарычнай і культурнай спадчыны, берагчы помнікі гісторыі і культуры» (пераклад наш. — *Д. Я., В. Н.*) [6]. Гэты Закон садзейнічае захаванню гістарычнай памяці праз ахову матэрыяльных гістарычных помнікаў як аб'ектаў, якія захоўваюць у сабе гэтую памяць.

*Рэспубліка Казахстан*. Апошняй рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Казахстан (2022 г.) не ўнесены змены ў частцы захавання гістарычнай памяці. Разам з тым падобныя палажэнні ўжо раней былі замацаваны арт. 37 Канстытуцыі, якая ўстанаўлівала абавязак кожнага грамадзяніна як захавання гістарычнай памяці, так і беражлівых адносін да помнікаў гісторыі [7]. Аналагічна Расійскай Федэрацыі, у Рэспубліцы Казахстан дзейнічае Закон «Аб ахове і выкарыстанні аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны».

*Азербайджанская Рэспубліка*. Канстытуцыя Азербайджанскай Рэспублікі змяшчае некалькі палажэнняў, якія замацоўваюць захаванне гістарычнай памяці. Так, артыкул 16 абвяшчае: «Азербайджанская дзяржава аказвае садзейнічанне развіццю культуры, адукацыі, аховы здароўя, навукі, мастацтва, ахоўвае прыроду краіны, гістарычную, матэрыяльную і духоўную спадчыну народа» (пераклад наш. — *Д. Я., В. Н.*), арт. 40 замацоўвае абавязак кожнага аб захаванні гістарычнай памяці, а арт. 77 — аб захаванні помнікаў гісторыі. Заканадаўствам Азербайджана замацаваны палажэнні аб увекавечанні памяці загінуўшых пры выкананні абавязку па абароне краіны, што рэгулюецца Законам «Аб увекавечанні памяці загінуўшых за Радзіму» [8].

*Кыргызская Рэспубліка*. У 2021 г. прынята новая Канстытуцыя Рэспублікі Кыргызстан. Папярэдняя Канстытуцыя дзяржавы змяшчала ў сабе толькі палажэнне аб абавязку грамадзян па захаванні гістарычных помнікаў. Дзеючая ж рэдакцыя, акрамя захавання ўказанага палажэння (арт. 15 Канстытуцыі), дапоўнілася главой III

«Духоўна-культурныя асновы грамадства» (пераклад наш. — *Д. Я., В. Н.*), якая таксама змяшчае арт. 21, які замацоўвае ўскладанне абавязку па захаванні гістарычнай спадчыны на дзяржаву [9]. Закон «Аб ахове і выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны» — першы па даце прыняцця закон (з цяпер дзеючых), які рэгламентуе адносіны ў галіне аховы гістарычнай спадчыны, ва ўсім СНД (1999 г.) [10].

*Рэспубліка Таджыкістан.* Канстытуцыя Рэспублікі Таджыкістан мае толькі адну норму, якая ўскосна змяшчае палажэнні аб захаванні гістарычнай памяці, — арт. 44, што замацоўвае ахову гістарычных помнікаў як абавязак кожнага грамадзяніна [11]. Разам з тым варта адзначыць, што і Таджыкістанам прымаюцца новыя заканадаўчыя акты ў гэтай галіне. Так, аналагічна шэрагу разгледжаных дзяржаў, адным з адносна нядаўніх новаўвядзенняў заканадаўства (2022 г.) стаў Закон Рэспублікі Таджыкістан «Аб увекавечанні памяці загінуўшых пры абароне Айчыны» [12].

*Рэспубліка Узбекістан.* У Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан не прадугледжана палажэнне аб замацаванні захавання гістарычнай памяці. Адзінае ўказанне на гістарычны досвед Канстытуцыя Узбекістана атрымала ў сваёй прэамбуле, дзе гаворыцца аб прыняцці дадзенага акта народам краіны, зыходзячы з гістарычнага досведу дзяржаўнасці і спадчыны продкаў [13]. Пры гэтым Канстытуцыя Рэспублікі Узбекістан атрымала сваё апошняе абнаўленне нядаўна, у 2023 г., але разгледжаных палажэнняў не атрымала. Таксама ў крымінальным заканадаўстве не прадугледжана палажэнняў, якія ўстанаўліваюць адказнасць за скажэнне гістарычных фактаў або аказанне іншага ўплыву на гістарычную праўду, а ў апошні час ні адзін заканадаўчы акт не замацоўваў неабходнасць захавання гістарычнай праўды.

Аналізуючы вышэйпададзенае, аўтары адзначаюць, што заканадаўчымі органамі большасці краін — удзельніц СНД у апошнія гады звернута ўвага на неабходнасць заканадаўчага замацавання захавання гістарычнай памяці і гістарычнай справядлівасці ў мэтах далейшага фарміравання гуманнага і развітога грамадства, уліку шматвяковага вопыту і традыцый дзяржаў, недапушчэння памылак мінулага. Меры па абароне названых мер у розных дзяржавах распрацаваны ў розным аб’ёме (у плане развіцця дзяржаўнай палітыкі ў гэтых пытаннях найбольшую работу выканалі Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя) і з’яўляюцца разнастайнымі па сваім змесце (шэраг дзяржаў лічыць неабходным захаванне праўды аб падзеях

Другой сусветнай войны, іншыя замацоўваюць ахову матэрыяльных гістарычных аб'ектаў). Вопыт кожнай краіны з'яўляецца ўнікальным, і яго вывучэнне можа садзейнічаць далейшаму развіццю заканадаўства ў гэтай сферы.

**Спіс асноўных крыніц**


1. Об объявлении 2022 года Годом исторической памяти [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь, 1 янв. 2022 г., № 1. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН».
2. Конституция Республики Беларусь = Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь = Constitution of the Republic of Belarus : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022 г. Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2022. 192 с.
3. Уголовный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 9 июля 1999 г., № 275-З : принят Палатой представителей 2 июня 2008 г. : одобр. Советом Респ. 24 июня 2008 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 08.01.2024 г. Доступ из информ.-поисковой системы «ЭТАЛОН».
4. Конституция Российской Федерации [Электронный ресурс]. URL: http://www.constitution.ru/ (дата обращения: 10.09.2024).
5. Уголовный кодекс Российской Федерации [Электронный ресурс] : 13 июня 1996 г., № 63-ФЗ : принят Гос. Думой 24 мая 1996 г. : одобр. Советом Федерации 5 июня 1996 г. : с изм. и доп. Доступ из справ.-правовой системы «КонсультантПлюс».
6. Об объектах культурного наследия (памятниках истории и культуры) народов Российской Федерации [Электронный ресурс] : Федер. Закон, 25 июня 2002 г., № 73-ФЗ : с изм. и доп. Доступ из справ.-правовой системы «КонсультантПлюс».
7. Конституция Республики Казахстан [Электронный ресурс] : принята на респ. референдуме 30 авг. 1995 г. // ИС Параграф «Юрист». URL: https://online.zakon.kz/Document/? doc_id=1005029 (дата обращения: 10.09.2024).
8. Конституция Азербайджанской Республики [Электронный ресурс] : вступила в силу 27 нояб. 1995 г. : с изм. и доп., принятыми на всенар. голосовании (референдуме) 24 авг. 2002 г., 18 марта 2009 г., 26 сент. 2016 г. // Официальный сайт Президента Азербайджанской Республики. URL: https://president.az/ru/pages/view/azerbaijan/constitution (дата обращения: 10.09.2024).
9. Конституция Кыргызской Республики [Электронный ресурс] : принята референдумом (всенар. голосованием) 11 апр. 2021 г. // Централизованный банк данных правовой информации Кыргызской Республики : [сайт]. URL: https://cbd.minjust.gov.kg/1-2/edition/1202952/ru (дата обращения: 10.09.2024).
10. Об охране и использовании историко-культурного наследия [Электронный ресурс] : Закон Кыргызской Респ., 26 июля 1999 г., № 91 : с изм. и доп. // Централизованный банк данных правовой информации Кыргызской

Республики : [сайт]. URL: https://cbd.minjust.gov.kg/4-240/edition/1024655/ru (дата обращения: 10.09.2024).

11. Конституция Республики Таджикистан [Электронный ресурс] : в ред. референдума от 26 сент. 1999 г., 22 июня 2003 г., 22 мая 2016 г. // Министерство иностранных дел Республики Таджикистан : [сайт]. URL: https://mfa.tj/ru/main/tadzhikistan/konstitutsiya (дата обращения: 10.09.2024).

12. Об увековечении памяти погибших при защите отечества [Электронный ресурс] : Закон Респ. Таджикистан, 24 дек. 2022 г., № 1919 // Министерство юстиции Республики Таджикистан : [сайт]. URL: http://adlia.tj/show_doc.fwx?rgn=143956 (дата обращения: 10.09.2024).

13. Конституция Республики Узбекистан [Электронный ресурс] : принята 8 дек. 1992 г. : вступила в силу 8 дек. 1992 г. URL: https://constitution.uz/ru (дата обращения: 10.09.2024).

**LEGISTATIVE CONSOLIDATION OF THE HISTORICAL MEMORY OF PEOPLE IN THE MEMBER COUNTRIES OF THE COMMONWEALTH OF INDEPENDENT STATES**

*Preservation of historical memory is one of the most urgent issues at all levels of social life. This issue could not be only debatable, and a number of states took measures to legislate provisions aimed at preserving historical memory, establishing responsibility for falsification of historical events. In the countries — participants of the Commonwealth of Independent States, active work was carried out and to this day is being carried out to change and supplement the legislation in the field of legislative consolidation of issues of historical memory. This article is devoted to a comparative analysis of the legislative consolidation of these issues in the Commonwealth of Independent States member states.*